7. Крысов, А.Г. Кардинал Р. Мерри-дель-Валь и традиция консерватизма в истории католической церкви: 1914–1930 гг.: Автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.03 / А.Г. Крысов; Московский педагогический гос. ун-т. – М., 2012. – 23 с.
8. О свободе совести и религиозных организациях: Закон Респ. Беларусь от 17 декабря 1992 года №2054-XII. – // Законодательство стран СНГ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://base.spinform.ru/show_doc.fwx?rgn=1854. – Дата доступа: 11.09.2018.
9. Общество // Президент Республики Беларусь. Официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by/ru/society_ru/. – Дата доступа: 11.09.2018.
10. Официальный ресурс Священнического Братства Святого Пия Х в Беларуси и СНГ // Официальный ресурс Священнического Братства Святого Пия Х в Беларуси и СНГ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fsspx.by/. – Дата доступа: 11.09.2018.
11. Паведамленне Старшыні ККББ наконт правядзення Брацтвам св. Пія Х рэкалекцый па метадзе св. Ігнацыя Лаёлы // Catholic.by [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://catholic.by/3/lib/documents/kkbb/4200-pavedamlenne-starshyni-kkbb-nakont-pravyadzennya-bratstvam-sv-piya-kh-rekalektsyj-pa-metadze-sv-ignatsyya-lajoly. – Дата доступа 10.11.2018.
12. Пучкин, Д.Э. Краткая история католического традиционалистского движения в г. Москве / Д.Э. Пучкин // Crusader.org.ru [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://crusader.org.ru/kratkaya-istoriya-katolicheskogo-tradicionalistskogo-dvizheniya-v-g-moskve.html. – Дата доступа: 11.09.2018.
13. Пытанне святару: Касцёл і Брацтва святога Пія Х // Каталіцкі Веснік [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://catholicnews.by/py-tanne-svyataru-kastsyol-i-bratstva-svyatoga-piya-x/. – Дата доступа 10.11.2018.
14. Тадэвуш Кандрусевіч: Я вяду дыялог на карысць Касцёла, міжканфесыйных і міжрэлігійных адносін і грамадства // Белорусский портал TUT.BY [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://news.tut.by/society/135807.html. – Дата доступа 10.11.2018.
15. Le Concile à la Russe – Entretien Alexandre Kryssov – Abbé de Tanoüarn // La nouvelle revue Certitudes [Electronic resource]. – Mode of access: http://certitudes.free.fr/nrc07/nrc07002.htm. – Date of access: 11.09.2018.
16. Pontifical Commission «Ecclesia Dei» // The Holy See [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.vatican.va/roman_curia/pontifical_commissions/ecclsdei/index.htm. – Date of access: 11.09.2018.

**Лебедзева Ірына Валянцінаўна**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ЭКАНАМІЧНАЯ ЭКСПЛУАТАЦЫЯ НЕПАЎНАЛЕТНІХ ЯК САЦЫЯЛЬНЫ МАРКЕР ЗМЕН У БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ Ў ПАЧАТКУ ХХ ст.

Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. ХІХ ст., якія разгарнуліся на тэрыторыі Расійскай імперыі, сталі вызначальным этапам у шэрагу мадэрнізацыйных пераўтварэнняў беларускага грамадства азначанага перыяду. І хоць правядзенне гэтых рэформ на тэрыторыі Беларусі было стрымана з-за палітыкі абмежаванняў у адносінах да пэўных катэгорый насельніцтва, праводзімай урадам Расійскай імперыі, тым не менш яны значна паўплывалі на змяненне ўсіх кірункаў жыцця. Гэта шматгранныя працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, працэсы сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці насельніцтва, росту сацыяльнай актыўнасці грамадства з пашырэннем пісьменнасці і адукацыі. З трансфармацыяй саслоўнай структуры пачынаецца і трансфармацыя адпаведных сацыяльных інстытутаў, адбываюцца істотныя змены ў заканадаўстве [2]. Такія сістэмныя працэсы ва ўсіх сферах жыцця суправаджаліся абвастрэннем

сацыяльных праблем, палярызацыяй грамадства, збядненнем насельніцтва, ломкай традыцыйнай маралі, што, безумоўна, прыводзіла да пагаршэння матэрыяльнага і сацыяльнага становішча сем'яў і ў першую чаргу негатыўна адбівалася на становішчы дзяцей. Асабліва яскрава гэта назіралася у першым дзесяцігоддзі XX ст., калі пад уплывам трансфармацыйных працэсаў пачаліся глыбокія змены традыцыйных сацыяльных інстытутаў, у першую чаргу, сям'і і дзяцей. Пацвярджэннем гэтаму можна лічыць вялікую ўвагу і ўрадавых структур, і грамадства спачатку да заканадаўчага вызначэння дзяцінства, ўзроставых катэгорый яго, а затым і станаўлення сістэмы аховы дзяцей праз дзейнасць грамадскіх арганізацый і выдання адпаведных законаў. Змяненні ў становішчы дзяцей, у тым ліку і ў сферы вытворчых адносінаў, такім чынам, і ёсць пэўны сацыяльны маркер адпаведных эвалюцыйных зменаў у грамадстве.

Працэсы мадэрнізацыі прамысловасці на тэрыторыі Беларусі вызначаліся пераходам на вытворчую спецыялізацыю прамысловасці. Характэрнай рысай прамысловага развіцця Беларусі з'яўляецца рост дробных прадпрыемстваў, якія былі заснаваны на перапрацоўцы мясцовай сыравіны. Гэта ў асноўным дрэваапрацоўчыя, папяровыя, запалкавыя, шкляныя, вінакурныя, цагляныя, скураныя, ільнопрадзільныя і іншыя прадпрыемствы. Ва ўмовах станаўлення і развіцця буржуазных адносінаў, ломкі традыцыйных сацыяльных адносінаў натуральнай з'явай таго часу станавілася эканамічная эксплуатацыя дзяцей.

Згодна з Першым Усеагульным перапісам насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. у пяці губернях: Мінскай, Магілёўскай, Гродзенскай, Віцебскай, Віленскай у прамысловасці, на транспарце і ў гандлёвых прадпрыемствах было занята 128476 чалавек, у тым ліку 21063 жанчыны. У цэлым удзельная вага жанчын сярод рабочых, занятых некваліфікаванай працай, складала 42 %, сельскагаспадарчых рабочых – 34 %, фабрычна-заводскіх – 23 %. Пры супастаўленні колькасці рабочых мужчын і жанчын у кожнай з узроставых груп, заўважна, што найбольшая колькасць працаўнікоў-жанчын прыпадала на дзіцячы ўзрост да 12 гадоў. Такім чынам занятасць дзяўчынак была большай, чым хлапцоў [11, с. XI].

Паступова з ростам буйной вытворчасці пашыралася і прымяненне жаночай і асабліва дзіцячай працы. Тлумачыцца гэта ў першую чаргу тым, што і рамеснікам, і уладальнікам прамысловых прадпрыемстваў было вельмі зручна прымаць на працу жанчын і, асабліва, дзяцей. Працавалі яны па 12–14 гадзін, а плата за гэтую працу была ўдвая і утрая меншая, чым праца дарослага мужчыны. У некаторых галінах прамысловасці (шкляная, запалкавая, тытунёвая, па перапрацоўцы лесу) праца дзяцей і падлеткаў амаль цалкам замяніла працу дарослых рабочых. Вельмі шырока яна прымянялася на дробных прадпрыемствах, якія знаходзіліся далёка ад буйных гарадоў. Напрыклад, на фабрыцы па вытворчасці аптэкарскіх каробак, якая знаходзілася ў в. Неманіца Барысаўскага павета, больш за трэціну складалі малыя дзеці. Яны пачыналі сваю працу ў 3–4 гадзіны раніцы і працавалі поўны дзень да позняга вечара, атрымліваючы па некалькі капеек у дзень [1, с. 47].

У саматужнай і рамесніцкай прамысловасці дзеці далучаліся да працы з 5–8 гадоў. Працуючы ў вельмі дрэнных санітарных умовах, у маларухомым стане пад час рамеснай працы, яны вельмі часта хварэлі на сухоты, тыф,

крываўку, залатуху, воспу і інш. Аб распаўсюджаных выпадках эксплуатацыі малалетніх дзяцей у прамысловасці шмат звестак утрымліваў перыядычны друк таго часу. Асабліва часта падобную інфармацыю можна было знайсці ў газеце «Мінскі лісток». Так, у № 15 за 1886 г. паведамляецца аб парушэннях закона аб працы малалетніх: «… дзеці і падлеткі прыходзяць на працу ў 7.30 гадзін раніцы, за паўгадзіны да прыходу дарослых рабочых, і заканчваюць працу разам з апошнімі ў 7.30 гадзін вечара. На працягу ўсяго дня робяць толькі адзін гадзінны перапынак для абеду, для снядання пэўнага часу не даецца і дзеці снедаюць, не адрываючыся ад працы. Працоўны дзень дзяцей працягваецца, такім чынам, 11 гадзін, замест законных васьмі і без усялякага адпачынку…» [12, с. 61]. Сістэматычнае выкарыстанне дзіцячай працы на працягу доўгага рабочага часу з'яўлялася прамым парушэннем заканадаўства, згодна з якім для дзяцей прадугледжваўся больш кароткі 8-гадзінны рабочы дзень. Часцей за ўсё такія парушэнні практыкаваліся на заводах і фабрыках шкляной, запалкавай, тэкстыльнай і іншых галін прамысловасці.

Нягледзячы на актыўную дзейнасць грамадскіх арганізацый, асабліва ў першым дзесяцігоддзі XX ст. эксплуатацыя дзяцей у прамысловасці не спынялася. У 1903 г. з агульнага складу прамысловых рабочых Беларусі 3,8% з'яўляліся малалетнімі (да 15 гадоў) і 10,8% – падлеткамі (ад 15 да 17 гадоў), у 1913 г. – адпаведна 3,4% і 10,1 %. Асабліва шырока прымянялася дзіцячая праца ў тэкстыльнай, харчовай, запалкавай, тытунёвай галінах прамысловасці [13, с. 237].

У сярэдзіне XIX ст. у Расійскай імперыі не было сфарміравана выразна акрэсленага фабрычна-заводскага заканадаўства, што ў пэўнай ступені замаруджвала прамысловае развіццё і рабіла рабочых фабрычна-заводскай і рамеснай вытворчасці безабароннымі перад свавольствамі ўласнікаў. Але развіццё буржуазных адносін і нарастаючы рух працоўных за свае правы ў сукупнасці з перыядычнымі саступкамі фабрыкантаў паўплывалі на эвалюцыю прамысловага заканадаўства. У ліку першых не без удзелу грамадскіх арганізацый 1 чэрвеня 1882 г. быў зацверджаны закон «Аб малалетніх, працуючых на фабрыках, заводах і мануфактурах» [7]. Ён устанаўліваў забарону працы дзяцей да 12 гадоў, для дзяцей 12–15 гадоў абмяжоўваў час працы да 8 гадзін у дзень (пры гэтым не больш за 4 гадзіны без перапынку), забараняў начную (ад 21 да 5 гадзін раніцы) і працу ў нядзелю, а таксама прымяненне дзіцячай працы на шкоднай вытворчасці. Уладальнікі прадпрыемстваў павінны былі «даваць магчымасць» дзецям наведваць школы не менш 3 разоў на тыдзень. Для нагляду за выкананнем пастаноў аб працы і навучанні малалетніх рабочых тым жа законам з 1 ліпеня 1882 г. была заснавана асобая інспекцыя, якая знаходзілася ў распараджэнні Міністэрства фінансаў па Дэпартаменту гандлю і мануфактур, якая і стала потым фабрычнай інспекцыяй. Закон быў уведзены ў дзеянне з 1 мая 1884 г., пры гэтым яшчэ два гады па дазволу міністра фінансаў не перапынялася «у выпадку неабходнасці» праца дзяцей 10-12 дзяцей і начная праца (не больш чым 4 гадзіны) дзяцей 12–15 гадоў ва ўсіх галінах прамысловасці. Акрамя фабрык і заводаў, дзеянне закона было распаўсюджана толькі на некаторыя «рамесныя ўстановы»: пякарні, друкарні, аўчынна-футравыя майстэрні і інш. Такая непаслядоўнасць у

прымяненні закона сведчыла аб тым, што ўрад, як і раней, знаходзіўся на пазіцыях абароны інтарэсаў прамысловасці.

5 чэрвеня 1884 г. быў прыняты закон «Аб спагнанні за парушэнні пастаноў аб працы малалетніх на заводах, фабрыках, мануфактурах і ў рамесных установах». Па ім за адпаведныя парушэнні прадугледжваўся арышт працадаўцы «не звыш 1 месяца або грашовае спагнанне не звыш 100 руб.» [3]. Праз год, 3 чэрвеня 1885 г. з'явіўся яшчэ адзін заканадаўчы акт, які забараняў начную працу жанчын і падлеткаў да 17 гадоў на баваўняных, палатняных і ваўняных фабрыках. У 1897 г. закон быў распаўсюджаны таксама на ўсю тэкстыльную вытворчасць [4].

Нягледзячы на прынятыя заканадаўчыя акты і дзейнасць фабрычнай інспекцыі па кантролю за іх выкананнем, парушэнні дапускаліся с абодвух бакоў. Па-першае, пастановы аб абмежаванні дзіцячай працы вельмі часта абыходзілі гаспадары прамысловых прадпрыемстваў, парушаючы працягласць працоўнага дня і забарону начной працы. Па-другое, самі бацькі былі зацікаўлены ў найхутчэйшым працаўладкаванні сваіх дзяцей, таму што часам праца дзіцяці была адзінай крыніцай даходаў сям'і. Таму нярэдка сустракалася фальсіфікацыя ўзросту дзіцяці. Заканадаўства, нагадаем, рэгламентавала ўзрост юных працаўнікоў і дазваляла працу на фабрыках, заводах і мануфактурах дзяцей з 12 гадоў. Дзеля таго, каб дзяцей працаўладкаваць, ім нярэдка «куплялі» гады. За тры рублі святар або прыстаў прыбаўлялі 10–11-гадоваму дзіцяці ў метрычным пасведчанні дадатковыя гады, і малалетні працаўнік трапляў на працу [10, с. 12]. Такая сітуацыя прыводзіла да таго, што дзеці самі не ведалі свайго дакладнага ўзросту. І калі ўзрост хлапцоў старанна кантраляваўся для далейшай службы ў арміі, то ў дачыненні да дзяўчынак вызначэнне ўзросту не мела прынцыповага значэння ні для сям'і, ні для грамадскага атачэння.

У 1890 г. расійскім урадам выдаецца новы акт, згодна з якім былі часткова перагледжаны папярэднія законы 1882 і 1885 гг.: малалетніх працаўнікоў з гэтага часу маглі «па роду вытворчасці, калі гэта будзе неабходным», далучаць да працы 6 гадзін у дзень без перапынку ці 9 гадзін у дзве змены па 4,5 гадзіны. У шкляной вытворчасці дазвалялася праца малалетніх да 6 гадзін уначы [6]. Галоўным прызначэннем новага закона лічылася тое, што ён замацаваў ужо існуючую практыку эксплуатацыі непаўналетніх рабочых. Такім чынам, заканадаўчыя акты 1882, 1855 гадоў (са зменамі) і 1890 г. былі ўключаны ў Статут аб Прамысловасці (фабрычнай, заводскай і рамесніцкай) 1893 г.

На тэрыторыі беларускіх губерняў напрыканцы XIX ст. існавала практыка кантролю за выкананнем заканадаўства ў адносінах дзіцячай працы з боку гарадскіх уладаў на абсалютна добраахвотных пачатках. Так, у 1892 г. па прапанове мінскага галавы К. Э. Чапскага з ліку ганаровых грамадзян г. Мінска была створана спецыяльная камісія для нагляду за працай малалетніх рабочых. Члены камісіі ўзялі на сябе абавязак нагляду за выкананнем пастаноў дзяржавы аб працы і адукацыі малалетніх рабочых уладальнікамі фабрык, заводаў і інш. [8, арк. 27-27аб]. На працягу дзейнасці камісіі ў 1892–1893 гг. Яе намаганнямі былі складзены спісы малалетніх рабочых г. Мінска, дзе паказваліся назвы вуліц ці фабрыкі, імя і прозвішча гаспадара ўстановы, назва спецыяльнасці, імя і прозвішча малалетняга працуючага, яго ўзрост, колькі гадзін працуе, ці працуе ў святочныя дні,

санітарнае становішча месца працы. У адпаведнасці са спісамі высветлілася, што ў працы былі занятыя, у асноўным, дзеці ва ўзросце ад 11 да 16 гадоў, найбольш распаўсюджанымі спецыяльнасцямі былі: кравец, белашвачка, сталяр, слесар, шапачнік, пячнік, шавец, пераплётчыца, рабочыя тытунёвай, панчошнай, папяровай, хлебапякарнай, шпалернай фабрык. Стан рабочага памяшкання і ўмовы працы дзяцей часцей за ўсё былі вельмі дрэннымі [8, арк. 42–43]. У сувязі з гэтым члены камісіі – медыкі ўзялі на сябе абавязак па аказанню медыцынскай дапамогі і дастаўцы неабходных лекавых сродкаў пры неабходнасці.

Сярод станоўчых мерапрыемстваў камісіі неабходна адзначыць таксама дзейнасць па арганізацыі бясплатных курсаў пісьменнасці для малалетніх рабочых. У прыватнасці, на пасяджэнні 14 сакавіка 1893 г. з удзелам К. Э. Чапскага было прынята рашэнне «адкрыць вячэрнія курсы пісьменнасці для малалетніх рабочых 3 разы на тыдзень, ад 7 да 8 гадзін вечара, кожны раз па аднаму занятку» у памяшканнях семінарыі, гарадской 4-класнай гімназіі і яўрэйскіх народных вучылішчаў, абавязаць «кожнага трымальніка рамеснай установы ўплачваць па 50 капеек за падручнікі і вучэбныя дапаможнікі» [8, арк. 110, 110 адв.]

Напярэдадні і ў самым пачатку Першай сусветнай вайны попыт на працу малалетніх значна ўзмацніўся, адпаведна павялічыўся і іх заробак. Дзяржава імгненна адрэагавала выданнем у кастрычніку 1915 г. новага закона, дзе да заканчэння вайны міністру гандлю і прамысловасці было прадстаўлена права дазволіць адступленні ад адпаведных законаў на прадпрыемствах, якія працавалі на абарону, а менавіта дазволіць працу дзяцей у шэрагу прадпрыемстваў [5]. Гэта прывяло да таго, што маленькія працаўнікі, назапасіўшы пэўны капітал знясільваючай работай, у падлеткавым узросце папаўнялі шэрагі злачынцаў і маргінальных слаёў грамадства. Імкнучыся ўзнагародзіць сябе за ўсё перажытае, паспытаўшы «салодкага жыцця» ў рэстаранах, у картачных гульнях і г.д., яны пасля таго, як сродкі заканчваліся ішлі на злачынствы, не адчуваючы асаблівага жадання зноў вяртацца да працы, матывавалі свае рашэнні наступным: «не жадаю больш поту ліць, дастаткова праліта» [9, с. 153–154].

Эксплуатацыя дзіцячай працы ў пачатку ХХ ст. уяўляла звычайную з'яву тагачаснай прамысловасці. Дзіцячая і падлеткавая праца складала каля 10,6 %. Пры гэтым ва ўзросце ад 12 да 17 гадоў працавалі 15,3 % дзяўчынак і 8,9 % хлопчыкаў, г. зн. працуючых дзяўчынак было амаль ў два разы больш, чым хлопчыкаў [11, с. Х–ХІ]. Дадзены факт тлумачыцца абмежаваным доступам дзяўчынак да адукацыі: у той час калі хлопчыкі мелі магчымасць навучацца ў прафесійных школах і вучылішчах, для дзяўчынак адсутнічала сістэма прафесійнай адукацыі. Таму навучацца яны вымушаны былі непасрэдна пад час працоўнай дзейнасці.

Эвалюцыя заканадаўства Расійскай імперыі сведчыла аб змяненні адносінаў грамадства да дзяцей і паступовым фарміраваннем пазіцыі, накіраванай на адстойванне інтарэсаў гэтай часткі грамадства. Дзіця ўжо не разглядалася як пасіўны аб'ект уздзеяння, а выступала як самастойны суб'ект, які актыўна ўдзельнічаў ў эканамічным жыцці краіны. Заканадаўства, якое тычылася працы непаўналетніх, за перыяд другой паловы ХІХ– пачатку ХХ ст. значна змянілася. Гэтыя змены закранулі ўзрост малалетніх рабочых, час працы і яе ахову, адначасова палепшыліся

ўмовы працоўнай дзейнасці і заработная плата. Змены ў становішчы маленькіх працаўнікоў з'яўляюцца яскравым сведчаннем, своеасаблівым маркерам зменаў усяго грамадства.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Андреева, Е. Г. Гуманистические идеи первоначального воспитания в дореволюционной Белоруссии / Е. Г. Андреева. – Минск : МПИ, 1985. – 96 с.
2. Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX–пачатку XX ст. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ. – 2017. 251 с.
3. О взысканиях за нарушения постановлений о работе малолетних на фабриках, заводах, мануфактурах и в ремесленных заведениях. № 2286 // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – СПб., 1887. – Т. 4. – С. 342–343.
4. О воспрещении ночной работы несовершеннолетним и женщинам на фабриках, заводах и мануфактурах. № 3013 // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – СПб., 1887. – Т. 5. – С. 261.
5. О допущении некоторых отступлений от правил о работе женщин, подростков и малолетних, а также о продолжительности и распределении рабочего времени // Собрание узаконений и распоряжение правительства, издаваемых при Правительствующем Сенате. – 1915. – Отд. II. – № 311. – Ст. 2312.
6. Об изменении постановления о работе малолетних, подростков и лиц женского пола на фабриках, заводах и мануфактурах и распространения правил о работе и обучении малолетних в ремесленных заведениях. № 6742 // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – СПб., 1895. – Т. 10. – Отд. 1. – С. 309-310.
7. О малолетних, работающих на фабриках, заводах и мануфактурах. № 931 // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – СПб., 1886. – Т. 2. – С. 265-267.
8. Об образовании и деятельности комиссии по надзору за трудом малолетних рабочих // НГАБ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 2322. – Лл. 27–27аб.
9. Рубашева, А. М. Дети-убийцы. – Харьков : Юрид. Из-во Наркомюста УССР.Шк. Друк. Діла им А. Багинського, 1926. – 177 с.
10. Синова, И.В. Дети в городском российском социуме во второй половине XIX – начале XX в. : проблемы социализации, девиантности и жестокого обращения / И. В. Синова. – СПб : ДМИТРИЙ БУЛАНИН, 2014. – 288 с.
11. Численность и состав рабочих в России. На основании данных Первой Всеобщей переписи населения Российской империи / Под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб : 1906. – Т. 1. – 318 с.
12. Хрестоматия по истории БССР / Сост. Е. М. Зуев, З. Ю. Копысский. – Ч. 1. – Минск: Гос. учебно-педагогическое изд-во Мин-ва просвещения БССР. – 155 с.
13. Экономика Белоруссии в эпоху империализма: 1900–1917 / Под ред. Г. Т. Ковалевского. – Минск : Изд-во Академии наук БССР. – 1963. – 420 с.



**Литвиновская Юлия Ивановна**

*Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники (Минск, Беларусь)*


# ВЫХОД БЕЛАРУСИ НА МЕЖДУНАРОДНУЮ АРЕНУ В УСЛОВИЯХ ПОЛЬСКО-СОВЕТСКОЙ ВОЙНЫ

Окончание Первой мировой войны имело важные последствия геополитического характера. На руинах Австро-Венгерской империи создавались новые национальные государства. Октябрьская революция в России вызвала к жизни процесс национально-государственного строительства на советской основе.

На рубеже 1918–1919 гг. сложилась весьма сложная для Советского государства внешнеполитическая обстановка. Вся политика партии большевиков и Советского правительства была направлена на защиту